

Адна з першых машын (павозка) з паравым рухавіком. XVIII ст.

паравой машыны. Прымяненне паравога рухавіка ў прамысловасці прывяло да рэзкага росту прадукцыйнасці працы.

*Такім чынам, асноўным вынікам эканамічнага развіцця Еўропы ў XVII–XVIII стст. стала прамысловая рэвалюцыя. У XIX ст. яна пашырыцца на ўсе еўрапейскія краіны, а затым і на ўвесь свет.*

***Ключавыя словы:** мануфактура, капіталіст, прамысловая рэвалюцыя.*

**Пытанні і заданні**

1. Якія прагрэсіўныя змены адбываліся ў сельскай гаспадарцы заходнееўрапейскіх краін? Чаму гэтыя пераўтварэнні ажыццяўляліся павольна?
2. Чым вызначалася ўзрастанне ролі гарадоў у Заходняй Еўропе?
3. Назавіце асноўныя ўмовы для развіцця капіталізму. Растлумачце, якім чынам гэтыя ўмовы сфарміраваліся ў заходнееўрапейскіх краінах.
4. Чаму мануфактурная вытворчасць дазваляла яе ўладальнікам атрымліваць найбольшы прыбытак?
5. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі высвятліце, якія тэхнічныя навaўвядзенні і вынаходкі з'явіліся ў Заходняй Еўропе ў XVII–XVIII стст. Чым было выклікана іх з'яўленне?
6. Складзіце аповед пра змены ў XVII–XVIII стст. ад імя заходнееўрапейскага: а) селяніна; б) наёмнага рабочага; в) уладальніка мануфактуры (на выбар). У аповедзе патлумачце прычыны гэтых змен.

# § 10. Паўсядзённае жыццё еўрапейцаў

**Успомніце.** *Якімі былі ўмовы жыцця простых людзей і знаці ў Сярэднявеччы?*

Эканамічнае развіццё краін, палітычныя падзеі і нават культура — гэта яшчэ не ўся гісторыя. Яе складовай часткай з'яўляецца тое, што адбываецца з дня ў дзень, гэта значыць паўсядзённае жыццё людзей. Каб мець больш поўнае ўяўленне аб далёкім і блізкім мінулым, нам неабходна ведаць, у якіх умовах жылі людзі, што елі, як апраналіся, пра што марылі і чаго баяліся.

**Вы даведаецеся.** *Якімі былі ўмовы жыцця еўрапейцаў у XVII–XVIII стст. Чаму адбываўся рост колькасці насельніцтва ў Заходняй Еўропе.*

**1. Насельніцтва Еўропы.** У сярэдзіне XV ст. у Еўропе пражывала каля 50 млн чалавек, у канцы XVIII ст. — амаль 200 млн. Асабліва хуткі рост назіраўся ў вядучых краінах Еўропы. У Англіі, напрыклад, за XVIII ст. насельніцтва вырасла амаль у два разы, у Францыі — у паўтара.

Аднак па-ранейшаму еўрапейцам пагражалі тры страшныя бедствы: голад, хваробы і войны. Усе тры навалы трымалі ў пастаянным страху




Рост насельніцтва Еўропы ў XVII–XVIII стст.

*Прааналізуйце дыяграму і на яе аснове пракаментуйце тэмпы росту еўрапейскага насельніцтва ў XVII–XVIII стст. Падумайце, чаму найбольшы рост насельніцтва ў XVIII ст. адбываўся ў вядучых краінах Еўропы.*

жыхароў вёсак і гарадоў. Так, неўраджайныя гады былі ўсё яшчэ частай з'явай у Еўропе. Войны суправаджаліся гвалтам і рабаваннямі. Людзі яшчэ не ўмелі змагацца з эпідэміямі чумы, воспы і тыфу. Напрыклад, толькі ў XVII ст. Парыж перажыў шэсць эпідэмій чумы. Нездарма малітва французскіх сялян пачыналася словамі: «Збаў нас, Божа, ад чумы, голаду і вайны».

Павелічэнне колькасці насельніцтва было звязана з ростам працягласці жыцця. У сельскай гаспадарцы, хоць і павольна, расла прадукцыйнасць працы. Дзякуючы пастаянным новаўвядзенням у многіх краінах павысілася ўраджайнасць. Людзі сталі лепш харчавацца, больш клапаціцца пра дзяцей, старых і хворых.

**2. Жыццё ў еўрапейскім горадзе.** Многія еўрапейскія гарады ўсё яшчэ захоўвалі сярэднявечнае аблічча. Звычайна яны былі невялікімі — з насельніцтвам 2—5 тыс. Гарады акалялі магутныя сцены. Але былі і буйныя гарады. Туды сцякаліся сяляне ў спадзяванні знайсці працу. Яны рабіліся грузчыкамі, ваданосамі або печнікамі і сяліліся ў халупах ў аддаленых прадмесцях.

97

Гарады паступова разрасталіся і змянялі сваё аблічча. Пры забудове новых раёнаў зносілі трушчобы, пракладвалі шырокія вуліцы



Агульны выгляд Лондана. Мастак *Томас Боўлз*. 1751 г.

*Якія дэталі карціны паказваюць на тое, што на ёй адлюстраваны горад Новага часу?*

і разбівалі плошчы. Буйны́я гарады сталі набываць сучасны выгляд. Перабудову Лондана, напрыклад, паскорыў вялікі пажар 1666 г., падчас якогда згарэла больш за 13 тыс. дамоў. Частыя пажары прымушалі гараджан будаваць дамы з каменю і цэглы.



Маладая жанчына са збаном вады. Мастак *Ян Вермеер*. 1660—1662 гг.

У цэнтры гарадоў размяшчаліся палацы знаці, дамы багатых гараджан, цэрквы і грамадскія будынкі, а таксама лазні, канторы адвакатаў і біржа.

Дом заможнага гараджаніна складаўся з гасцёўні, спальні і пакоя для прыслугі. У вокны ўсё часцей устаўлялі шкло. Бяднейшыя людзі па-ранейшаму выкарыстоўвалі для гэтага пергамент і прамасленую паперу. Дамы ацяпляліся печамі або камінамі. У XVII ст. сталі ўваходзіць у моду дахі, пакрытыя чарапіцай.

Падлогу выкладвалі каменнай або керамічнай пліткай, а ў палацах знаці — паркетам. Гладкая тынкаваная столь стала папулярнай толькі ў XVIII ст. Да гэтага столевыя бэлькі не хавалі, а ўсяляк аздаблялі. Сцены ў багатых дамах драпіравалі дыванамі, аксамітам і атласам, на поўначы Еўропы абівалі разьбянымі дубовымі панэлямі. З канца XVII ст. пачалося распаўсюджанне папяровых шпалер. Спачатку іх выкарыстоўвалі бяднейшыя людзі, а затым і знаць.

Асаблівай раскошай лічыўся ванны пакой. Ватэрклазеты (унітазы) упершыню з'явіліся ў каралеўскіх палацах у XVI ст. Большасць жа гараджан яшчэ доўгі час вылівалі памыі на вуліцу.

У гарадскіх дамах стол перастаў быць раскошай. З'явіўся сапраўдны ложак, над якім вісеў полаг. Гэтая прылада абараняла тых, хто спіць, ад клапоў, тараканаў і іншых насякомых, якімі кішэлі і халупы, і палацы.

**3. Жыццё ў вёсцы.** Сельскія дамы на поўначы Еўропы будавалі з дрэва, на поўдні — з каменю. Дах крылі саломай або трыснягом. У галодныя гады такое пакрыццё часта ішло на корм жывёле. Сялянскі

93—



Жытло селяніна

*Назавіце не менш за тры прыкметы таго, што на малюнку паказана жытло селяніна. Знайдзіце пацвярджэнне свайго пункту гледжання ў тэксце параграфа.*

дом рэдка дзяліўся на пакоі. Усе сямейнікі жылі ў агульным памяшканні. Яно ацяплялася ачагом, дзе гатавалі ежу. Кухоннае начынне складалася з патэльні, гаршкоў і збаноў. Місак і кубкаў, як правіла, на ўсіх не хапала, таму елі з агульнага посуду. Мэблі ў сялянскай хаце было мала: куфар, часам табурэткі. Але часцей выкарыстоўвалі лаўкі, на якіх сядзелі і спалі, падкладаючы набіты саломай сяннік.

**4. Адзенне.** Адзенне абараняе людзей ад холаду, дажджу або сонца. Але акрамя таго яно служыць паказчыкам становішча чалавека ў грамадстве. Адзенне і мода па-свойму адлюстроўваюць тую ці іншую гістарычную эпоху.

У Еўропе XVI–XVIII стст. па вопратцы лёгка было адрозніць двараніна і простага чалавека. Нават багатым гараджанам забаранялася апранацца так, як апраналіся прадстаўнікі знаці. У спецыяльным указе імператара Карла V ад 1543 г. гаварылася, што адзенне павінна дапамагаць адрозніць «князя ад графа,



Вяртанне фермера.
Мастак *Ёган Цофані.* 1762 г.

*З дапамогай карціны апішыце вопратку простых людзей. Параўнайце яе са строямі знатных людзей.*

Касцюмы немцаў і французаў XVIII ст. Фрагменты гравюры 1780-х гг.



графа ад барона, барона ад бюргера, бюргера ад селяніна». Адзенне знатных людзей было багатым і раскошным. Дамы сцягвалі таліі гарсэтамі на металічных планках; спадніца нагадвала звон. Асаблівая ўвага надавалася прычоскам. Парадны мужчынскі касцюм складаўся з кароткіх штаноў і камзола. На баль мужчыны апраналі белыя панчохі.

Многія пажылыя людзі, прытрымліваючыся старой моды, упрыгожвалі свой убор гафрыраванымі каўнярамі, вядомымі пад назвай «млынавыя жорны».

Аксэсуарам багатых людзей лічыўся белы шырокі каўнер, які шчыльна прылягаў да шыі. Такі каўнер бярэ свой пачатак у іспанскай модзе XVI ст. Яго шылі з вельмі тонкага палатна, затым рабілі складкі і моцна крухмалілі, а часам насаджвалі на драцяны каркас для шчыльнасці. Імкненне прадстаўнікоў шляхты падкрэсліць сваю перавагу вяло да павелічэння памераў каўняра, які стаў такім велізарным, што атрымаў назву «млынавыя жорны».



Партрэт шлюбнай пары. Мастак *Антоніс ван Дэйк.* 1618 г.

**5. Харчаванне.** Харчаванне людзей залежала перш за ўсё ад іх маёмаснага становішча. Бо нездарма прыказка кажа: «Скажы мне, што ты ясі, і я скажу табе, хто ты ёсць». Вялікую ўвагу ў палацах звярталі на сервіроўку стала. Гэта было складанае мастацтва. Таму, як накрываць на стол, якія стравы і калі падаваць, як рассаджваць людзей на прыёмах, прысвячалі цэлыя трактаты. Нягледзячы на гэта, застольныя



95—97



Абед з вустрыцамі.
Мастак *Жан-Францыа дэ Труа.*
1735 г.

*Складзіце меню святочнага абеду ў багатай дваранскай сям'і ў XVIII ст.*

манеры, з пункту гледжання сучаснага чалавека, усё яшчэ заставаліся грубымі. Мяса ў XVI ст. елі рукамі, якія выціралі абрусам. Відэльцам у той час карысталіся толькі ў Італіі.

У XVI–XVIII стст. большасць людзей харчаваліся пераважна расліннымі прадуктамі. Пры гэтым пшаніца, рыс і кукуруза былі маладаступныя. Белы хлеб ажно да XVIII ст. лічыўся раскошай. Еўрапейцы гатавалі ў асноўным грубыя поліўкі і кашы з аўса, проса, ячменю. Мяса ўжывалі па святах. Пілі таннае віно і піва.

Зусім іншай была кухня знаці і багачоў. Іх штодзённы рацыён адрозніваўся вялікай разнастайнасцю мясных і рыбных прадуктаў. Асабліва цанілася дзічына: фазаны і рабчыкі. Гародніна на сталах арыстакратаў з'яўлялася рэдка, таму што лічылася ежай беднякоў.

Пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў у Еўропе з'явіліся невядомыя раней напоі: шакалад, чай, кава, завезеныя з далёкіх азіяцкіх краін і Амерыкі. Паступова ўкараняліся новыя культуры: кукуруза, тытунь, бульба. Апошняя доўгі час лічылася ежай бедных людзей.

**6. Гігіена.** Узровень гігіены ў Еўропе быў невысокі. У XVI–XVII стст. ён нават знізіўся ў параўнанні з XV ст. Прычынай таму стала распаўсюджанне хвароб, прывезеных з Новага Свету. Амаль зніклі грамадскія лазні, бо людзі небеспадстаўна лічылі іх рассаднікам небяспечных захворванняў. Мыла ў Еўропе выраблялі недастаткова. Зубы чысцілі, жуючы мускатны арэх. Нават у палацах манархаў і вяльмож чысціня была адноснай.

*Такім чынам, у ранні Новы час еўрапейскія гарады і вёскі ўсё яшчэ захоўвалі сярэднявечнае аблічча. Большая частка насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці. Хоць і павольна, будаваліся і разрасталіся еўрапейскія гарады.*

**З кнігі М. М. Карамзіна «Лісты рускага падарожніка»**

*Прачытайце два апісанні еўрапейскага горада.*

1. Гмахі будынкаў наперадзе, з высокімі спічакамі і купаламі… На вялікай васьмікутовай плошчы ўзвышаецца статуя Людовіка XV, аточаная белым мармуровым балюстрадам. Падыдзіце да яе — і вы ўбачыце перад сабою густыя алеі слаўнага саду Цюільры, што прымыкаюць да раскошнага палаца… Узыдзіце на вялікую тэрасу; паглядзіце навокал: паўсюль велізарныя будынкі, замкі, храмы — прыгожыя берагі Сены, гранітныя масты.
2. Цесныя вуліцы, абразлівае змяшэнне багацця з галечаю; каля бліскучай крамы ювеліра — куча гнілых яблыкаў і селядцоў, паўсюль бруд і нават кроў, што цячэ ручаямі з мясных радоў…
   Вуліцы ўсе без выключэння вузкія і цёмныя ад вялізных дамоў… Гора бедным пешаходам, а асабліва калі ідзе дождж! Вам трэба або мясіць бруд на сярэдзіне вуліцы, або вада, якая льецца з дахаў… не пакіне на вас сухой ніткі.

*Ці могуць абодва апісанні датычыцца аднаго горада? Растлумачце, чаму вы так думаеце.*

### Пытанні і заданні

**1.** Як змянялася колькасць насельніцтва Заходняй Еўропы ў XVII–XVIII стст.? З чым былі звязаны гэтыя змены? Для адказу выкарыстайце дыяграму на с. 59.

**2.** Як змянілася знешняе аблічча еўрапейскіх гарадоў у XVII–XVIII стст.? Што захавалася ў іх ад Сярэднявечча?

**3.** Уявіце сябе падарожнікам, які пабываў у Заходняй Еўропе ў XVII ст. Як бы вы апісалі побыт еўрапейцаў: знатных людзей, багатых гараджан, бедных сялян? Выкарыстайце для свайго аповеду ілюстрацыі ў параграфе.

**4.** Як вы думаеце, чаму быў выдадзены ўказ аб тым, што адзенне павінна дапамагаць адрозніць «князя ад графа, графа ад барона, барона ад бюргера, бюргера ад селяніна»? З апорай на ілюстрацыі параграфа вызначце, у чым гэтыя адрозненні выяўляліся.

**5.** Запоўніце пропускі ў лагічным ланцужку «Прычыны росту колькасці насельніцтва Заходняй Еўропы» ў сшытку.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Рост прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы → | → | Павелічэнне працягласці жыцця → | → | Пашырэнне плошчы гарадоў і рост гарадскога насельніцтва |

## § 11. Дзяржава ў XVII–XVIII стст.

**Успомніце.** *Як называліся органы саслоўнага прадстаўніцтва ў Англіі, Францыі? Чаму ў Познім сярэднявеччы адбывалася ўзмацненне каралеўскай улады? Якія пласты насельніцтва былі зацікаўлены ў моцнай уладзе караля?*

У Новы час склаліся дзве асноўныя формы дзяржаўнага кіравання: абсалютная манархія і парламенцкая дзяржава. Абсалютная манархія дасягнула росквіту ў XVII–XVIII стст. Парламенцкая дзяржава стала вынікам буржуазных рэвалюцый у Еўропе і Амерыцы.

**Вы даведаецеся.** *Прычыны фарміравання абсалютызму. Што характэрна для абсалютнай манархіі. Як абсалютызм праяўляўся ў Францыі.*

**1. Формы дзяржаўнага кіравання.** У Сярэднія вякі найбольш распаўсюджанай формай праўлення была манархія. У шэрагу еўрапейскіх краін складвалася саслоўна-прадстаўнічая манархія. Гэта азначала, што ўлада кіраўніка дзяржавы была абмежаваная органамі саслоўнага прадстаўніцтва духавенства, дваран, гараджан.

У канцы Позняга сярэднявечча — пачатку Новага часу каралеўская ўлада ўзмацнілася, што прывяло да абмежавання дзейнасці органаў саслоўнага прадстаўніцтва. У выніку ў XVII–XVIII стст. склалася новая форма дзяржаўнай улады — абсалютная манархія, або ***абсалютызм***. Гэта стала магчымым ва ўмовах развіцця капіталістычнай вытворчасці, калі